**РАШЭННЕ ВЫБАРЧАЙ КАМІСІІ**
**“Аб зацвярджэнні палітыкі бяспекі**
**правядзення выбараў у Каардынацыйную Раду”**

12 красавіка 2024 года г. Варшава

У адпаведнасці з пунктам 5 Устаноўчай дамовы ад 5 красавіка 2024 года зацвярджаецца Палітыка бяспекі правядзення выбараў у Каардынацыйную Раду:

## ПАЛІТЫКА БЯСПЕКІ
**Правядзення выбараў у Каардынацыйную Раду**

1. Палітыка распрацавана ў мэтах захавання бяспекі ўдзельнікаў мерапрыемстваў па выбарах у Каардынацыйную Раду (далей - выбарчы працэс), а таксама абароны правоў і свабод чалавека пры апрацоўцы персанальных дадзеных, у тым ліку правоў на недатыкальнасць прыватнага жыцця, таямніцу галасавання, а таксама рэгламентацыі прынцыпаў і асноўных патрабаванняў да апрацоўкі персанальных дадзеных у адпаведнасці з Агульным рэгламентам абароны персанальных дадзеных (GDPR) Еўрапейскага Саюза.
2. Пры правядзенні выбарчага працэсу забяспечваюцца ўмовы, якія выключаюць уцечку персанальных дадзеных асобам, органам і арганізацыям, якія не ўдзельнічаюць у правядзенні выбарчага працэсу. Апрацоўка дадзеных ажыццяўляецца метадам псеўданімізацыі[1].
3. У выпадку ўцечкі персанальных дадзеных асобам, якія не атрымалі адпаведнага дазволу на доступ да іх, збор персанальных дадзеных неадкладна спыняецца, усе атрыманыя падчас выбарчага працэсу персанальныя дадзеныя неадкладна знішчаюцца, усе выбаршчыкі неадкладна інфармуюцца аб здарэнні.
4. Аб’ём персанальных дадзеных, якія падлягаюць перадачы, абумоўлены неабходнасцю падцвердзіць прыналежнасць выбаршчыка да грамадзянства Рэспублікі Беларусь і залежыць ад абранага асобай спосабу ідэнтыфікацыі выбаршчыка.
5. Кожнай асобе, якая перадае свае персанальныя дадзеныя, прапануецца азнаёміцца з дадзенай палітыкай бяспекі. Перадача персанальных дадзеных павінна ажыццяўляцца толькі пры ўмовах дачы на гэта згоды ў празрыстай і зразумелай форме з зазначэннем суб’екта, якому гэтыя дадзеныя перадаюцца, а таксама падцвярджэння асобай аб азнаямленні з дадзенай палітыкай бяспекі.
6. У мэтах абароны сваіх персанальных дадзеных асоба мае права атрымаць доступ да сваіх персанальных дадзеных, атрымаць інфармацыю, якая тычыцца апрацоўкі яе персанальных дадзеных; патрабаваць выключэння ці выпраўленні няслушных ці няпоўных персанальных дадзеных.
7. Кантралёрам персанальных дадзеных з’яўляецца Выбарчая камісія. Збор персанальных дадзеных выбаршчыкаў ажыццяўляецца цягам 72 гадзін, адведзеных на галасаванне.

[1] «Псеўданімізацыя» - апрацоўка персанальных дадзеных такім чынам, што іх больш немагчыма аднесці да канкрэтнага суб'екта дадзеных без выкарыстання дадатковай інфармацыі, пры ўмове, што такая дадатковая інфармацыя захоўваецца асобна, і ў дачыненні да яе прыняты тэхнічныя і арганізацыйныя меры, якія прадухіляюць яе аднясенне ідэнтыфікаванаму або якая індэтыфікуецца фізічнай асобе.

8. Выбарчая камісія у мэтах арганізацыі і правядзення выбарчага працэсу можа звяртацца да спецыялістаў у сферы лічбавай бяспекі і прыцягваць іх у якасці працэсараў пры ўмове падпісання імі дадзенай палітыкі бяспекі.

9. Выбаршчыкі маюць права даць згоду на доступ да персанальных дадзеных неабмежаванаму колу назіральнікаў за выбарамі ў Каардынацыйную Раду. У такім выпадку назіральнікі атрымаюць права доступу да персанальных дадзеных толькі ў мэтах праверкі адпаведнасці волевыяўлення выбаршчыкаў і не маюць права захоўваць і распаўсюджваць атрыманыя дадзеныя. Умовай допуску назіральнікаў да выбарчага працэсу з’яўляецца падпісанне дадзенай палітыкі бяспекі. Удзел назіральнікаў у выбарчым працэсе рэгламентуецца адпаведным Палажэннем.

10. Тэрмін захавання персанальных дадзеных абмяжоўваецца выбарчым працэсам і не можа перавышаць 9 сутак. Пасля вычарпання магчымасцяў абскарджання выніковага рашэння па выбарах у Каардынацыйную Раду ўсе атрыманыя персанальныя дадзеныя выдаляюцца цягам 24 гадзін. Па рашэнні Выбарчай камісіі ў мэтах бяспекі персанальныя дадзеныя могуць быць выдалены да гэтага тэрміну.

11. Пры выяўленні несапраўднасці персанальных дадзеных, яны неадкладна выдаляюцца, а голас, аддадзены выбаршчыкам, не ўлічваецца, пра што паведамляецца асобе, якая іх накіравала.

Старшыня Выбарчай Камісіі А. Прыходзька